Вялікая роля тут належыць фальклорным калектывам, дзейнасць якіх абапіраецца на аўтэнтычныя ўзоры пераймання і засваення народна-песенных традыцый.

Вывучэнне і аднаўленне народна-песенных традыцый немагчымае без усведамлення асаблівасцей бытавання фальклорных твораў у тым ці іншым этнаграфічным кантэксце. Само ўзнікненне народных песень адбывалася ў сувязі з пэўнай абрадавай ці побытавай практыкай. Яны суправаджалі працоўную дзейнасць чалавека, важнейшыя падзеі яго жыцця: нараджэнне, шлюб, смерць, дапамагалі ў выхаванні дзяцей, транслююючы новым пакаленням жыццёвую мудрасць, веды і вопыт. Інакш кажучы – былі непарыўна звязаныя з традыцыйным кантэкстам, існавалі ў замацаваных мясцовымі традыцыямі сітуацыях. Асабліва гэта тычыцца выканання абрадавых твораў. Таму задача вывучэння і аднаўлення перарастае ў праблему рэканструкцыі той ці іншай фальклорнай з'явы, таго ці іншага абраду. Пры гэтым выкананне народнай песні, гульні, танца альбо карагоду пры пэўных умовах уяўляе сабой абрад, мэтай якога можа з'яўляцца ўстанаўленне сувязяў з навакольным светам, уздзеянне на прыродныя стыхіі (рэканструкцыя каляндарнага абраду) або атрыманне падтрымкі заступнікаў роду і г.д. (рэканструкцыя сямейнага-родавага абраду).

Трэба падкрэсліць, што адарваная ад кантэксту абрадавая песня гучыць зусім інакш, чым у сітуацыі яе спрадвечнага існавання. Нават у выкананні саміх носьбітаў традыцыі, якія выйшлі на сцэну, могуць губляцца характэрныя асаблівасці тэмбру, ладу, рытмікі, у выніку чаго песня можа набыць не ўласцівы ёй лірычны характар.

У сучасных фальклорных калектывах абрадавая песня можа прагучаць больш або менш натуральна падчас мадэлявання абрадавай сітуацыі. Ва ўмовах горада мэтазгодна выкарыстоўваць для мадэлявання святы каляндарнага цыклу (Каляды, Масленіца, Гуканне вясны, Юр'я, Троіца, Купалле, Жніво), якія могуць набыць характар усеагульнага народнага святкавання. Пры такім мадэляванні адбываецца паглыбленне ўдзельнікаў калектыву ў сферу абраду, а іх выкананне атрымлівае эмацыянальную афарбоўку, што забяспечвае неабходны характар гучання. Вясну «гукаюць спеўнымі купкамі «з гары на гару»; з велікоднымі і юраўскімі абыходнымі крокамі крочаць ад хаты да хаты; купальскія спяваюць уначы і па прызначэнні (як вянкі завіваюць, як абыходзяць жыта, як запальваюць вогнішча і водзяць карагоды, гуляюць і дражняць адно аднаго, як раніцай сустракаюць сонца)» [2, с. 106]. Пры гэтым не абавязкова выпрацоўваць які-небудзь дакладны сцэнарый. Шматлікія формы агульных шэсцяў, карагодаў, гульняў, танцаў і інш. разлічаны на свабоднае далучэнне ўсіх жадаючых, што дазваляе лёгка стварыць незабыўную атмасферу народнай эстэтыкі. Патрабуецца толькі ініцыятыўны ўдзел фальклорных калектываў, для якіх выхад на вуліцу становіцца не формай канцэртнага выступлення, а спосабам выказвання святочнага стану. Для саміх удзельнікаў фальклорнага калектыву гэта дае выключную магчымасць уключыцца ў абрадавую сітуацыю, перажыць яе, адчуць сябе не толькі пераемнікам, але і носьбітам народна-песенных традыцый.

Відавочна, працэс мадэлявання абрадавай сітуацыі – гэта працэс сатворчасці асоб. Супрацоўніцтва з рознымі калектывамі стымулюе творчы працэс, нараджае пачуццё значнасці і каштоўнасці ўласнай мастацка-творчай дзейнасці. Гэта пэўным чынам уплывае на характар успрымання і выканання твораў, якія захапляюць вобразнасцю, непаўторнасцю, яскравым каларытам і выклікаюць суперажыванне. Гледачы-саўдзельнікі свята імкнуцца не толькі слухаць спевы гуртоў, але і актыўна падпяваць. Такое калектыўнае выкананне песень спрыяе творчай актывізацыі ўдзельнікаў, у выніку чаго яны па-новаму асэнсоўваюць і ацэньваюць сілу эмацыянальнага ўздзеяння фальклору, якая ўзнікае падчас агульнага выканання твораў. Адна справа – бачыць, як гэта робяць іншыя, а другая – самому прыняць удзел у свяце. Так, праз сумесную творчасць удзельнікі свята з вялікім задавальненнем, натхненнем і лёгкасцю засвойваюць нацыянальныя мастацкія традыцыі, глыбока пранікаюць у сутнасць фальклорных вытокаў і традыцыйнай культуры. І ў гэтым сэнсе фальклор валодае неабмежаванымі магчымасцямі для праяўлення ініцыятывы, актыўнасці асобы, здольнай выкарыстаць успрыманне прыгожага для выпрацоўкі стымулу маральнага самаўдасканалення і духоўнага развіцця.

**Спіс літаратуры:**

1. Лихачев, Д. С. Прошлое – будущему. Статьи и очерки / Д. С. Лихачев. – М. : Наука, 1985. – 576 с.
2. Пладунова, Т. А. Этнафанія стылі выканання і вакальная практыка ў аматарскім фальклорным калектыве / Т. А. Пладунова // Традыцыйная культура і дзеці. Праблема этнавыхавання. В. 2 : матэр. III Рэсп. навук.-практ. канф. (19 – 20 красавіка 2006 г., г.п. Акцябрскі) ; аўт. праекта і ўклад. М. А. Козенка. – Мінск : БелДІПК, 2006. – С. 101–108.
3.

*Людміла Ражкова*

## АСАБЛІВАСЦІ РЭАЛІЗАЦЫІ ПЕДАГАГІЧНАГА ПАТЭНЦЫЯЛУ ФАЛЬКЛОРУ Ў МАСТАЦКІМ АМАТАРСТВЕ

*У артыкуле разглядаюцца асаблівасці рэалізацыі педагагічнага патэнцыялу фальклору ў мастацка-педагагічнай сістэме аматарскіх калектываў фальклорнага кірунку, аналізуецца спецыфіка дзейнасці калектываў «сцэнічнага» і «побытавага» тыпу.*

*Liudmila Razhkova*

## SPECIFIC FEATURES TO USE PEDAGOGICAL POTENTIAL OF FOLKLORE IN AMATEUR ART

*The article features the realization of pedagogical potential of folklore in art-pedagogical system of amateur folklore groups. These collectives can be described as connected with «scenic» and «household» types.*

З актуалізацыяй у сучасным грамадстве патрэбы ў этнічнай самарэалізацыі маладога пакалення ўсё большую ролю ў вырашэнні акрэсленай задачы адыгрываюць сацыякультурныя ўстановы, якія ствараюць адпаведныя ўмовы для якаснага росту ўсіх параметраў жыцця асобы, для яе развіцця і самарэалізацыі. Асабліва перспектыўнымі для задавальнення этнічнай самарэалізацыі сучаснай асобы з'яўляюцца аматарскія калектывы мастацкай творчасці фальклорнага кірунку, дзе магчыма далучэнне асобы да народнай творчасці, яе каштоўнасцей ва ўмовах горада і вёскі, у якіх амаль што зніклі ачагі фальклорнай культуры.

Фальклор на пачатку XXI стагоддзя ўяўляецца нацыянальнай каштоўнасцю, падмуркам нацыянальнай культуры, гарантам захавання этнічнай своеасаблівасці беларускай культуры і нацыянальнай мовы. Комплексныя даследаванні фальклору паказваюць, што існуюць пэўныя прынцыпы яго функцыянавання, якія з'яўляюцца асноватворнымі. Гэта:



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

унутрысітуацыйнасць, сінкрэтызм, традыцыйнасць, вуснасць, калектыўнасць. Менавіта яны на працягу ўсяго існавання фальклорнай культуры рэгулявалі працэсы сацыялізацыі асобы, фарміруючы менавіта той від народнай самасвядомасці, якога патрабаваў час. Аднак далейшыя працэсы развіцця этнічнай супольнасці выклікалі разбурэнне асновы фальклорнай культуры – умоў, якія гарантавалі яе захаванасць: нязменнае асяроддзе, абмежаванне знешніх уплываў, варыятыўнасць на аснове традыцыі і іншыя. У канцы XIX і пачатку XX стагоддзя фальклор перастае адыгрываць сістэмаўтвараючую ролю ў грамадстве, што і адбілася на сістэме сацыялізацыі асобы, якая істотна змянілася.

Мастацкае аматарства фальклорнага кірунку – цікавая і складаная з'ява, якая спалучае ў сабе каштоўнасці фальклорнай культуры і нормы прафесійнага мастацтва. У дадатак да функцый, належных уласна аматарству, фальклорнае аматарства вымагае надання такім калектывам і дадатковых функцый: функцыі пашырэння суб'екта фальклорнай дзейнасці, функцыі прапаганды, засваення, асэнсавання, захавання і рэканструкцыі фальклору, функцыі этнічнай самарэалізацыі ўдзельнікаў. Для рэалізацыі названых функцый сродкамі фальклору, і асабліва апошніх, у мастацкім калектыве патрабуецца выкарыстанне педагагічнага патэнцыялу традыцыйнай народнай творчасці. Педагагічны патэнцыял фальклору як сукупнасць умоў і фактараў, якія аказваюць выхаваўчае ўздзеянне на асобу, магчыма падзяліць на дзве часткі: адна з іх складаецца з педагагічных ідэй, інфармацыі, кода, заключаных у паэтычным змесце фальклорнага твора і яго ладава-меладычна-рытмічнай пабудове, а другую ўтвараюць спецыфічныя спосабы існавання традыцыйнай народнай творчасці (унутрысітуацыйнасць, вуснасць, традыцыйнасць, калектыўнасць, сінкрэтызм).

Педагагічны патэнцыял фальклору і педагагічны патэнцыял аматарства фальклорнага кірунку – не тоесныя паняцці. Іх агульныя рысы абумоўлены падабенствам мастацка-творчай дзейнасці ў фальклоры і аматарстве. Разам з тым, яны (педагагічныя патэнцыялы) не могуць быць зведзены адзін да другога ў выніку рознай прыроды гэтых з'яў. Фальклор ва ўмовах мастацкага аматарства не існуе як з'ява. Мастацкае аматарства фальклорнага кірунку належыць узроўню фалькларызму, а не фальклору.

Каб не быць галаслоўным, прапаную параўнаць мастацка-творчыя працэсы «сцэнічных» і «побытавых» аматарскіх калектываў фальклорнай арыентацыі.

Працэс навучання ў названых тыпах калектываў працякае па-рознаму. Так у калектывах «бытавога» тыпу (этнааўтэнтычныя і, набліжаныя да іх, этнаграфічныя) мастацка-педагагічная праца будуецца аналагічна сістэме навучання традыцыйных фальклорных гуртоў. У калектывах «сцэнічнага» тыпу (фальклорна-сцэнічныя і народна-акадэмічныя) мастацка-педагагічная праца будуецца аналагічна сістэме навучання, прынятай у акадэмічным мастацтве. Гэтыя дзве сістэмы вельмі розныя. Параўнаць іх можна па некалькіх параметрах: рэжыме ажыццяўлення дзейнасці, рэгламентацыі ўзаемаадносін кіраўніка і ўдзельнікаў, спосабе кіравання вучэбным працэсам з боку кіраўніка, рэпертуарнай палітыцы, выканальніцкай і сацыякультурнай дзейнасці. За аснову былі ўзятыя дадзеныя У.І. Сітнікава [1, с. 95-97].

1. Навучанне ў аматарскіх фальклорных калектывах «сцэнічнага» тыпу выступае як асобны спецыялізаваны і самастойны этап іх мастацка-творчай дзейнасці. Ён мае рэгулярны характар і выступае як сістэма арганізаваных заняткаў (рэпетыцый) у адпаведнасці з дакладным раскладам. Тэматыка вучэбных заняткаў залежыць ад канкрэтных задач, якія ставіць перад сабой і калектывам кіраўнік; канцэртных праграм, якія рыхтуе калектыў. Таму асноўнае намаганне калектыву і кіраўніка (па дадзеных нашага назірання) скіравана на ўдасканаленне выканальніцкага майстэрства ў абраным жанры.

Працэс жа навучання ў «бытавых» калектывах ажыццяўляецца непасрэдна падчас выканання тых ці іншых твораў ва ўмовах паўсядзённага жыцця; ён мае ўпарадкаваны, перыядычны характар, які абумоўлены земляробча-гаспадарчым календаром і сямейна-бытавым абрадавым цыклам.

Як мы бачым, і ў тым, і ў іншым выпадку адбываецца рэгламентацыя групавой творчай дзейнасці, толькі зададзена яна рознымі прычынамі. Дзейнасць «сцэнічных» калектываў траціць адзін з сутнасных прынцыпаў існавання фальклорнай культуры – унутрысітуацыйнасць. Будучы спецыяльна арганізаванай дзейнасцю такія калектывы трацяць сувязь з бытам, паўсядзённым і святочным. Іх дзейнасць не суадносіцца з прынцыпам прыродаадпаведнасці (кола святаў, рытуалаў і дзеянняў, што суправаджаюць іх і паўтараюцца штогод).

2. Навучанне ў аматарскіх калектывах «сцэнічнага» тыпу пабудавана на культуры пісьмовай традыцыі ў адпаведнасці з прынцыпамі агульнай і прадметнай дыдактыкі. Мае мэтанакіраваны характар. У выхаваўчым працэсе калектываў, як звычайна, прысутнічаюць суб'ект-аб'ектны (настаўнік-вучні) характар зносін, які зададзены інстытуцыянальнай адукацыяй і падтрымліваецца формай заняткаў.

Вуснасць жа – адна з прынцыповых умоў існавання фальклору, адна з умоў перадачы фальклорнай інфармацыі. Праз спецыфічныя спосабы навучання, якія належаць фальклорнай традыцыі, адбываецца не толькі ўсведамленне замацаваных традыцыяй норм маралі, звычак, гістарычнага шляху народа, яго каштоўнасцей, не толькі фарміраванне творчых здольнасцей чалавека, якія стымулююць яго на стварэнне новага ў межах традыцыі, але адбываецца і фарміраванне каштоўнаснага свету чалавека, што ўяўляецца нам вельмі значным. Такі спосаб перадачы спадчыны меў ненаўмысны характар.

У «сцэнічных» калектывах падчас вучэбнай работы назіраецца строга ўсталяваны характар зносін паміж кіраўніком калектыву, які паведамляе інфармацыю, і навучэнцамі, якія гэтую інфармацыю спажываюць. Такі характар зносін зададзены агульнай адукацыяй, змест якой пераносіцца і ў мастацкае аматарства. Таксама і паміж удзельнікамі калектыву падчас выканальніцтва прасочваецца складанае ўзаемадзеянне, бо сінхроннасць і зладжанасць сцэнічнага дзеяння дасягаюцца толькі дзякуючы спецыяльным рэпетыцыйным заняткам, а рэжысёрскае рашэнне кампазіцыі канцэртных нумароў мае франтальна-лінейны характар. Такі канцэртны нумар вельмі цяжка перанесці ў бытавую сферу і амаль немагчыма адаптаваць да несцэнічных умоў.

У фальклорнай жа культуры тып зносін у час фальклорнага дзейства мае іншы характар і дазваляе фарміраваць стэрэатып раўнапраўнага ўзаемадзеяння на аснове ўзаемнай павагі і добразычлівасці. Форма кола, якая назіраецца пры такім тыпе зносін, дазваляе выканаўцам і гледачам свабодна мяняць сваю пазіцыю на актыўную ці пасіўную, рабіць гэта з аднолькавым поспехам, у залежнасці ад свайго эмацыянальнага настрою і ролі.

3. Выкарыстанне рэпертуару ў «сцэнічных» калектывах мае свае заканамернасці. Рэпертуар мае суб'ектыўны характар фарміравання і засваення. Выкарыстоўваецца ён у адпаведнасці з вырашэннем дыдактычных задач у калектыве. Падбіраецца з улікам асаблівасцей успрымання гледачамі канцэртна-сцэнічнага дзейства. Пільная ўвага пры падборы рэпертуару надаецца яго выразнасці, жанравай і стылявой разнастайнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У фальклорнай жа культуры рэпертуар мае аб'ектыўную абумоўленасць фарміравання, засваення і ўзнаўлення фальклорных твораў у згодзе з абрадавымі цыклaмі і бытавымі патрэбамі выканаўцаў. Засвойваюцца ўзоры толькі адной лакальнай традыцыі і выконваюцца яны толькі тады, калі павінны гучаць. Калядныя песні ніколі не спяваюцца летам.

4. Калі для носьбітаў фальклорнай творчасці і нават для ўдзельнікаў этнааўтэнтычных калектываў фальклор з'яўляецца спосабам жыцця, то адносіны да фальклору ўдзельнікаў фальклорна-сцэнічных калектываў прынцыпова іншыя. Удзельнікі такога калектыву з дапамогай фальклору дэманструюць сябе ў якасці артыста, выканаўцы. Выканальніцтва – гэта эстэтычна спецыялізаваная форма дзейнасці ў фальклорных калектывах сцэнічнага тыпу і накіравана перш за ўсё на стварэнне прадукту выканальніцкага мастацтва. Таму, натуральна, што ўсе намаганні кіраўніка і ўдзельнікаў скандэнтраваны на падрыхтоўцы канцэртнай праграмы, канцэртных нумароў.

Выканальніцкая дзейнасць у фальклорнай культуры носіць не спецыялізаваны характар. Прынцыповая несцэнічнасць, бытавая накіраванасць, уплеценасць мастацка-творчай дзейнасці ў паўсядзённае жыццё, у рэальныя абставіны – адна з яе сутнасных характарыстык.

Такім чынам, разважаючы і далей над гэтымі паралелямі, мы прыйшлі да высновы, што з акадэмізацыяй форм мастацка-творчай дзейнасці застаецца значна менш магчымасцей для цэласнай рэалізацыі педагагічнага патэнцыялу фальклору, таму што не прымаюцца да ўвагі асноватворныя асаблівасці існавання фальклорнай творчасці і не ствараюцца ўмовы для іх імітацыі. Ступень уплыву выхаваўчага патэнцыялу фальклору на асобу ў межах такіх калектываў прама залежыць ад паўнаты рэалізацыі ў яго мастацка-творчым працэсе гэтых асаблівасцей: сінкрэтызму, традыцыйнасці, вуснасці, калектыўнасці і ўнутрысітуацыйнасці, што павінна ўлічвацца пры працы з удзельнікамі мастацкіх аматарскіх калектываў, якія працуюць з фальклорнымі ўзорамі.

**Спіс літаратуры:**

1. Ситников, В. И. Теоретико-методологические основы совершенствования подготовки руководителей коллективов фольклорной самодеятельности : дис. … канд. пед. наук : 13.00.05 / В. И. Ситников. – СПб., 1992. – 187 л.
4. Смирнова, Е. И. Художественная самодеятельность как социально-педагогическое явление : дис. … д-ра пед. наук : 13.00.05 / Е. И. Смирнова. – Л., 1989. – 488 л.

*Наталля Мазурына*

**МЕХАНІЗМЫ СТВАРЭННЯ ВАРЫЯНТАЎ НАРОДНЫХ ПЕСЕНЬ:
РОЛЯ ПСІХАЛАГІЧНЫХ ПРАЦЭСАЎ ІМПРАВІЗАЦЫІ І АНТЫЦЫПАЦЫІ**

*У артыкуле асэнсаванне механізмаў з'яўлення варыянтаў твораў народнапесеннага мастацтва адбываецца з дапамогай аналізу псіхалагічных працэсаў асобы спевака-імправізатара. Вышэйшай формай варыятыўнасці (змяняемасці) з'яўляецца імправізацыя – арганічная ўласцівасць вуснага тыпу камунікацыі. Працэс імправізацыі звязаны з дзейнасцю апераджальнага, ці антыцыпіруючага мыслення. Аналізуецца шэраг этапаў працэсу выканання-імправізацыі, абумоўленых бягучым становішчам мыслення імправізатара, што прыводзіць да нечаканых варыянтаў.*

*Natalia Mazurina*

**MECHANISMS OF THE OPTIONS FOLK SONGS:
THE ROLE OF PSYCHOLOGICAL PROCESSES OF IMPROVISATION AND ANTICIPATION**

*In the article the understanding of mechanisms appearance of the folk songs options is done by the analysis of psychological processes, personality of the improviser singer. The higher form of variants in folk songs is improvisation – the type of organic property in oral communication. The process of improvisation is associated with the activities of advancing or anticipatory thinking. A number of the stages of the improvisation process analyzed caused the current state of thinking of the improviser, which leads to unexpected choices.*

Адна з цікавых і малавывучаных старонак у беларускай і ў цэлым у славянскай фалькларыстыцы – варыянтнасць праяў народнай творчасці. Аналіз фактараў і механізмаў з'яўлення варыянтаў твораў народнапесенага мастацтва не губляе сваёй навуковай актуальнасці да сённяшняга часу. Аднак даследчыкі пастаянна сутыкаюцца з тым фактам, што для вырашэння сучасных задач навукі і практыкі небходна прыцягваць веды і інструменты з іншых галін навукі. Непадзельнасць, цэласнасць, сінкрэтызм фальклорных з'яў і працэсаў з'яўляецца передумовай для распрацоўкі тэарэтычных прынцыпаў інтэграванага падыходу як асновы для развіцця новых кірункаў традыцыйных навук. Так, напрыклад, псіхалінгвістыка, якая на сёння арганічна ўлілася ў сістэму навук, узнікла на пачатку 50-х гадоў ХХ ст. падобным чынам.

Шматгадовы вопыт навукова-даследчай і педагагічнай працы аўтара артыкула дазваляе казаць аб неабходнасці ўліку і вывучэння месца і ролі псіхалагічных працэсаў у існаванні і развіцці фальклору. Заўважым, што да такіх жа высноў прыйшлі і прадстаўнікі фалькларыстычнай школы БДУ. На іх погляд, псіхафалькларыстычны кірунак у сучаснай фалькларыстыцы дазваляе распрацоўваць перш за ўсё пытанні, звязаныя з асобай-стваральнікам і тымі шляхамі, па якіх ідзе прадуцыраванне тэкстаў [2].

Вусны характар народнай творчасці нарадзіў такую спецыфічную рысу фальклору, як імправізацыйнасць. У першую чаргу нас цікавіць разгляд псіхалагічных механізмаў імправізацыі як працэсу ў народнай песеннай творчасці. З'ява імправізацыі вядомая са старажытнейшых часоў. Яе важнейшая роля ва ўзнікненні і развіцці шэрагу мастацтваў, у тым ліку і народнапесеннага, падкрэсліваецца ў даследаваннях такіх фалькларыстаў, як К.В.Чыстоў, У.П.Анікін, А.М.Астахава,



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ